АН БССР в обозначенный рамками исследования период, т. к. именно они отражают политику учреждения в сфере науки, а также помогают раскрыть связи науки и производства на данном этапе.

Таким образом, документы Центрального научного архива НАН Беларуси представляют собой широкий массив различного рода материалов, которые раскрывают деятельность АН БССР в области научных исследований в сфере промышленности.


1. Академия наук Белорусской ССР / Н. А. Борисевич [и др.]. – Минск : Главная редакция Белорусской Советской Энциклопедии, 1979. – 600 с.
2. Жук, С. А. Развитие организационных форм подготовки научных кадров в АН БССР (середина 1940-х – середина 1960-х гг.) / С. А. Жук // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А, Гуманитарные науки. – 2022. – № 9. – С. 18–26.
3. Центральный научный архив НАН Беларуси (далей – ЦНА НАНБ) [Электронный ресурс] // Институт истории Национальной академии наук Беларуси. – Режим доступа: http://history.by/central_scientific_archive_of_the_national_academy_of _sciences_of_belarus/. – Дата доступа: 10.03.2023.
4. ЦНА НАНБ. – Ф. 1. Оп. 1. Д. 103.
5. ЦНА НАНБ. – Ф. 1. Оп. 1. Д. 125.
6. ЦНА НАНБ. – Ф. 1. Оп. 1. Д. 151.
7. ЦНА НАНБ. – Ф. 1. Оп. 1. Д. 502.


**Бараноўскі А.В.**

## ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ ДА БІЯГРАФІЙ ПАРТЫЙНЫХ І САВЕЦКІХ КІРАЎНІКОЎ РАЁННАГА ЗВЯНА ВІЦЕБСКАГА РЭГІЁНА (1924–1991 ГГ.)

Асноўнай крыніцай да біяграфій партыйных і савецкіх кіраўнікоў раённага звяна Віцебскага рэгіёна 1924–1991 гадоў з'яўляюцца дакументы і матэрыялы з фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь – НАРБ (найбольшую цікавасць уяўляюць дакументы за 1930–1938 гг. калі раёны знаходзіліся ў прамым падпарадкаванні БССР, за выключэннем раёнаў, што ў 1935 г. былі аб'яднаны ў Лепельскую і Полацкую акругі), Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці – ДАВВ (захоўваюцца дакументы партархіва Віцебскага абкама КПБ, а таксама дакументы савецкіх органаў улады Бешанковіцкага, Віцебскага, Высачанскага (1924–1931), Гарадоцкага, Езярышчанскага (1924–1929, Мехаўскага 1935–1958, 1958–1962), Кузняцоўскага (1924–1927), Лёзненскага, Мяжанскага (1924–1931), Суражскага (1924–1960), Ульскага (1924–1931, 1946–1956), Чарэйскага (1924–1931), Чашніцкага, Шумілінскага (Сіроцінскага 1924–1961, 1961–1962, з 1966) раёнаў), Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Глыбокае – ЗДАГ (захоўваюцца дакументы савецкіх органаў улады Браслаўскага, Бягомльскага (1924–1960), Відзаўскага (1940–1960), Глыбоцкага, Дзісненскага (1940–1959), Докшыцкага, Дунілавіцкага (1940–1960), Міёрскага, Пастаўскага, Пліскага (1940–1962), Шаркаўшчынскага раёнаў), Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Оршы – ЗДАО (захоўваюцца дакументы савецкіх органаў улады Аршанскага, Арэхаўскага (1946–1956), Багушэўскага (1924–1931, 1935–1960), Дубровенскага, Копыскага (1924–1931), Коханаўскага (1924–1931, 1946–1956), Сенненскага, Талачынскага раёнаў), Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Полацку – ЗДАП (захоўваюцца дакументы савецкіх органаў улады Асвейскага (1924–1959), Верхнядзвінскага (Дрысенскага 1924–1962), Ветрынскага (1924–1931, 1935–1960), Лепельскага, Полацкага, Расонскага, Ушацкага раёнаў).

З архівасховішча НАРБ найбольшую цікавасць для даследчыкаў уяўляюць фонды: ЦВК БССР (ф. 6), Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь (ф. 968), Камісіі па ўстанаўленні персанальных пенсій пры Савеце Міністраў БССР (ф. 1529), ЦК КПБ (ф. 4п), Цэнтральнай кантрольнай камісіі КП(б)Б (ф. 15п) і інш. Асноўную ж частку дакументальных крыніц складаюць дакументы і матэрыялы ДАВВ з фондаў: Віцебскага акруговага выканкама (ф. 118), Віцебскага аблвыканкама (ф. 1966-ААФ), Аршанскага акруговага камітэта КП(б)Б (ф. 10062-п), Віцебскага акруговага камітэта КП(б)Б (ф. 10051-п), Лепельскага акруговага камітэта КП(б)Б (ф. 10063), Полацкага акруговага камітэта КП(б)Б (ф. 10061-п), Віцебскага абкама КПБ (ф. 1), Віцебскага прамысловага абкама КПБ (ф. 9520-п), Віцебскага сельскага абкама КПБ (ф. 9556-п), Полацкага абкама КПБ (ф. 10060-п), Віцебскай акруговай кантрольнай камісіі КП(б)Б – рабоча-сялянскай інспекцыі БССР (ф. 10073-п), Аршанскай акруговай кантрольнай камісіі КП(б)Б – рабоча-сялянскай інспекцыі БССР (ф. 10077-п), Органаў партыйна-дзяржаўнага кантролю Полацкай акругі (ф. 10075-п-ААФ), райкамаў КПБ (42 фонды) і інш. У даследаванні таксама прадстаўлены дакументальныя матэрыялы з фондаў занальных архіваў Віцебскай вобласці: Аршанскі акруговы выканкам (ф. 1 ЗДАО), Полацкі акруговы выканкам (ф. 104 ЗДАП), Полацкі аблвыканкам (ф. 686 ЗДАП), раённыя Саветы дэпутатаў і іх выканаўчыя камітэты і інш. У фондах Расійскага дзяржаўнага архіва сацыяльна-палітычнай гісторыі захоўваецца картатэка персанальнага ўліку членаў партыі. Архівісты РДАСПГ ажыццяўляюць пошук улікова-партыйных дакументаў (справаздачныя карткі на партбілеты, уліковыя карткі на партбілеты, рэгістрацыйныя бланкі на партбілеты) па нумарах партбілетаў.

У корпусе выяўленых і даследаваных архіўных крыніц найбольшую каштоўнасць уяўляюць матэрыялы справаводства. Згодна з функцыянальным прызначэннем і зместам іх можна падзяліць на наступныя групы дакументаў:

1. распарадчыя (загады, пастановы, рашэнні);
2. пратакольныя (пратаколы і выпіскі з іх);
3. справаздачныя (справаздачы, даклады, дакладныя запіскі);
4. службовая перапіска;
5. асабістыя (асабістыя справы, асабістыя справы па прыёме ў партыю, персанальныя справы на камуністаў, асабістыя справы персанальных пенсіянераў рэспубліканскага значэння, асабістыя карткі членаў выканкамаў, анкеты дэлегатаў з'ездаў Саветаў, анкеты дэлегатаў партыйных канферэнцый, анкеты абследаванняў здароўя) і інш.

У дадзеным артыкуле засяродзім увагу на апошняй групе матэрыялаў справаводства, паколькі яна ўтрымлівае поўныя біяграфічныя звесткі асобаў на момант стварэння дакумента. Асабістыя справы адказных работнікаў ўключаюць у сябе розныя дакументы, размешчаныя ў пэўнай паслядоўнасці: дадатак да асабістага лістка па ўліку кадраў, асабісты лісток па ўліку кадраў (часам са здымкам), аўтабіяграфію, характарыстыку, дакументы аб прызначэнні і вызваленні ад пасады, даведку, вопіс дакументаў наяўных у справе. Асабістыя справы па прыёме ў члены партыі змяшчаюць заяву, анкету, аўтабіяграфію, тры рэкамендацыі, выпіскі з рашэння агульнага сходу партарганізацыі, пастановы бюро райкама КПБ. У персанальнай справе звычайна змяшчаліся наступныя дакументы: заява камуніста, тлумачальная запіска, даведка на члена партыі, выпіска з уліковай карткі, характарыстыка, заключэнне па разглядзе персанальнай справы, выпіскі з пратаколаў бюро парторганаў аб прынятым рашэнні па справе і інш. Персанальныя справы заводзіліся на членаў партыі якія парушылі партыйную дысцыпліну, здзейснілі рознага роду правіну. Асабістыя справы персанальных пенсіянераў рэспубліканскага значэння ўключаюць у сябе розныя дакументы: заяву, хадайніцтва аб прызначэнні пенсіі, асабісты лісток па ўліку кадраў (часам са здымкам), аўтабіяграфію, характарыстыку, рашэнне па справе, дакументы на падставе якіх прымалася рашэнне аб спыненні выплаты пенсіі (пасведчанне аб смерці, заява аб спыненні выплаты пенсіі, пастанова аб спыненні выплаты пенсіі) і інш. Персанальную пенсію рэспубліканскага значэння маглі атрымліваць як асоба, што мела асаблівыя заслугі перад дзяржавай, так і яе родныя (у выпадку смерці). Асабістыя карткі членаў выканкамаў змяшчаюць наступныя звесткі на адказнага работніка: назва выканкама або Савета; прозвішча, імя, імя па бацьку; дата і месца нараджэння; нацыянальнасць; валоданне мовамі; сацыяльнае становішча; прафесія; адукацыя; маёмаснае становішча; сямейнае становішча; служба ў войску; знакі вайсковай і працоўнай адзнакі; членства ў прафсаюзе, грамадскіх арганізацыях, партыі; ці падвяргаўся рэпрэсіям; колькі разоў абіраўся на з'езды Саветаў, у члены выканкамаў і Саветаў; пасада, стаж; адрас і інш [1, 3, 4]. Як анкеты дэлегатаў партыйных канферэнцый [5], так і анкеты дэлегатаў з'ездаў Саветаў [2] утрымліваюць наступныя звесткі: кім дэлегаваны; прозвішча, імя, імя па бацьку; узрост (год нараджэння); нацыянальнасць; сацыяльнае становішча; партыйнасць (парстаж); ці падвяргаўся рэпрэсіям; ці быў у другіх партыях; адукацыя; прафесія (пасада); ці прымаў удзел у партыйных каферэнцыях (колькі разоў абіраўся на з'езды Саветаў, у члены выканкамаў і Саветаў). У анкетах дэлегатаў з'ездаў Саветаў таксама змяшчаюцца звесткі аб роднай мове; маёмасным становішчам; службе ў войску; знаках вайсковай і працоўнай адзнакі; членствах у прафсаюзе, грамадскіх арганізацыях; службовым і хатнім адрасе. Пэўныя біяграфічныя звесткі ўтрымліваюць анкеты абследаванняў здароўя: прозвішча, імя, імя па бацьку; узрост; пасада; склад сям'і; самі вынікі медыцынскага абследавання адказных работнікаў [6]. Такім чынам, першаснай крыніцай да біяграфій першых сакратароў райкамаў КПБ і старшынь райвыканкамаў Віцебскага рэгіёна з'яўляюцца дакументы і матэрыялы з архівасховішч Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, занальных дзяржаўных архіваў Віцебшчыны.

Дакументальныя матэрыялы, а таксама фотаздымкі кіраўнікоў Віцебскага рэгіёна – удзельнікаў Першай сусветнай вайны і Вялікай Айчыннай вайны можна адшукаць у электронных банках даных, што размешчаны ў адкрытым доступе ў сетцы Інтэрнэт. Так, на сайце партала "Памяти героев Великой войны 1914–1918 годов" створаным Міністэрствам абароны Расійскай Федэрацыі пры падтрымцы Федэральнага архіўнага агенцтва і Расійскага гістарычнага таварыства размешчаны дакументы і матэрыялы аб удзельніках Першай сусветнай вайны. Сёння для пошуку даступны значны комплекс дакументаў аб стратах (справаздачна-інфармацыйныя карткі, імянныя спісы страт, апавяшчэнні аб прыёме параненага, карткі на тых, хто прыбыў у лазарэт, картка на выбыўшых з лазарэта) рускай арміі. Усе гэтыя дакументы як мінімум змяшчаюць наступныя звесткі пра чалавека: прозвішча, імя, імя па бацьку; месца нараджэння (губерня, павет, воласць, паселішча); воінскае званне і часць. У асобных крыніцах пазначана прычына недзеяздольнасці (хвароба, раненні, кантузія), веравызнанне. Інфармацыйны рэсурс таксама змяшчае імянныя спісы ўзнагароджаных рознымі ўзнагародамі

Расійскай Імперыі. Як правіла гэты тып дакументаў змяшчае прозвішча, імя, імя па бацьку; месца нараджэння (губерня, павет, воласць, паселішча); воінскае званне і часць; від і нумар ўзнагароды. Найменш інфарматыўным тыпам дакументаў, прадстаўленых на дадзеным сайце, з'яўляюцца карткі ваеннапалонных. У іх указвалася прозвішча, імя, імя па бацьку; год нараджэння; месца нараджэння (губерня, павет, воласць, паселішча), лагер [8]. Такім чынам, прадстаўленныя на партале "Памяти героев Великой войны 1914–1918 годов" дакументы і матэрыялы дапамагаюць аднавіць лёсы тых, хто служыў у царскім войску ў 1914–1918 гадах.

Інтэрактыўны сэрвіс "Память народа" аб'ядноўвае раней створаныя Міністэрствам абароны Расійскай Федэрацыі агульнадаступныя банкі даных "Мемориал" і "Подвиг народа в Великой Отечественной войне 1941–1945 годов" аб удзельніках Вялікай Айчыннай вайны. Сёння для пошуку даступны значны комплекс дакументаў па ўзнагароджаннях (узнагародныя лісты, указы аб узнагароджаннях, загады аб узнагароджаннях). Сярод іх найбольш значнай крыніцай для даследчыкаў з'яўляюцца ўзнагародныя лісты. Яны, як правіла складаліся з наступных граф: прозвішча, імя, імя па бацьку; званне; пасада, часць; назва ўзнагароды да якой прадстаўляецца; год нараджэння; нацыянальнасць; партыйнасць; удзел у баявых дзеяннях (дзе, калі); раненні і кантузіі; з якога часу ў Чырвонай Арміі; якім райваенкаматам прызваны; чым раней узнагароджаны; хатні адрас і адрас сям'і; кароткі выклад подзвігу або заслуг. Інтэрактыўны сэрвіс таксама змяшчае лічбавыя копіі дакументаў аб стратах (імянныя спісы памерлых ад ран, загады аб выключэнні са спісаў Чырвонай Арміі, статкарты на памерлых у лячэбных установах, карткі ўліку параненых і хворых, спісы зніклых без вестак і інш.) Чырвонай Арміі. Як правіла гэты тып дакументаў змяшчае: прозвішча, імя, імя па бацьку; год нараджэння; званне і пасаду; адрас сям'і. На сайце прадстаўленны і копіі сапраўдных трафейных дакументаў, галоўным чынам аб савецкіх ваеннапалонных. Сярод іх найбольш змястоўнымі з'яўляюцца нямецкія персанальныя карткі № I (Personalkarte I). Яны змяшчаюць наступныя звесткі пра ваеннапалоннага: прозвішча, імя, імя бацькі, дзявочае прозвішча маці; дата і месца нараджэння; веравызнанне; грамадзянства; званне і пасада; калі ўзяты ў палон; лагер; фота; адбітак правага ўказальнага пальца і інш. Значная частка кіраўнікоў Віцебскага рэгіёна, асабліва сакратары райкамаў КП(б)Б, прызываліся ў войска ў якасці палітработнікаў. На іх заводзіліся спецыяльныя карткі якія сёння захоўваюцца ў картатэцы асабістых спраў Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. У картцы палітработнікаў як правіла, змяшчаліся наступныя звесткі: прозвішча, імя, імя па бацьку; дата і месца нараджэння; адукацыя і партыйнасць; хатні адрас; звесткі аб родных; зваінне і пасада. На жаль, на партале не прадстаўлены дакументы з картатэкі асабістых спраў, аднак на ім пазначаны нумары скрынь, у якіх захоўваюцца неабходныя карткі палітработнікаў, што значна спрашчае далейшыя пошукі [7]. Такім чынам, інтэрактыўны сэрвіс "Память народа" дазваляе па наяўных у базе архіўных дакументах аднавіць баявы шлях вайскоўцаў ад месца прызыву да месца гібелі, ці апошняга месца службы ў войску, а таксама спампаваць здымкі асобных удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

Спецыяльны праект Выдавецкага дома "Беларусь сегодня" і Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь "Партизаны Беларуси" ўключае індывідуальную картатэку партызан і падпольшчыкаў, біяграфічныя звесткі аб беларускіх партызанах – Героях Савецкага Саюза, легендарных камбрыгах, баях і бітвах, звязаных з партызанскім рухам. Размешчаная на партале інтэрактыўная картка партызана ўтрымлівае наступныя звесткі: прозвішча, імя, імя па бацьку; месца і год нараджэння; нацыянальнасць; узнагароды; прыналежнасць да партызанскага атрада, брыгады; электронныя копіі сапраўдных дакументаў (карткі асабістых спраў, асабістыя лісткі па ўліку кадраў, узнагародныя лісты, узнагародныя спісы, характарыстыкі і іншыя матэрыялы) [9]. Сярод прадстаўленных на сайце дакументаў найбольш каштоўнымі крыніцамі для даследчыкаў з'яўляюцца асабістыя лісткі па ўліку кадраў. Такім чынам, праект "Партизаны Беларуси" дазваляе па наяўных у базе архіўных дакументах з фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь аднавіць баявы шлях, працоўную дзейнасць (да 1941 г.) удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, а таксама спампаваць здымкі легендарных партызан.

Асобную групу крыніц складаюць матэрыялы перыядычнага друку. Перыёдыка разглядаецца асобна, як спецыфічная сістэма гістарычных крыніц, аб'яднаных у рамках канкрэтных выданняў. Газеты з'яўляюцца адной з найбольш распаўсюджаных груп перыядычных крыніц, што ўтрымліваюць заканадаўчыя і актавыя дакументы, творы аналітычнага і мастацка-публіцыстычнага жанраў, мемуарныя творы і інш. Дакументальныя матэрыялы да біяграфій партыйных і савецкіх кіраўнікоў можна адшукаць у падшыўках рэгіянальных («Заря Запада» (1924–1929), «Віцебскі пралетарый» (1929–1938), «Віцебскі рабочы» (1938–2013) і мясцовых (раённых) газет Віцебшчыны. Паколькі кіраўнікі Віцебскага рэгіёна абіраліся дэпутатамі раённых, абласных Саветаў дэпутатаў і Вярхоўнага Савета БССР, найбольшую цікавасць у даследчыкаў выклікае асвятленне выбарчых кампаній у перыядычным друку (спісы членаў выбарчых камісій, спісы зарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты, біяграфіі зарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты, біяграфіі абраных дэпутатаў). Пэўныя біяграфічныя звесткі ўтрымліваюць дакументы і матэрыялы камітэтаў КПБ і выканкамаў, што публікаваліся на старонках газет.

Важнай крыніцай для напісання біяграфій першых сакратароў райкамаў КПБ і старшынь райвыканкамаў Віцебскага рэгіёна з'яўляюцца інтэрв'ю даследчыкаў з шэрагам былых кіраўнікоў, а таксама з іх калегамі, роднымі і блізкімі.

Такім чынам, комплекс біяграфічных крыніц прадстаўлены разнастайнымі па ступені навуковай значнасці, паўнаце і шырыні ахопу дакументамі і матэрыяламі, што дапамагаюць аднавіць лёсы партыйных і савецкіх кіраўнікоў раённага звяна Віцебскага рэгіёна 1924–1991 гг.


1. ДАВВ. – Ф. 118. Воп. 1. Спр. 635.
2. ДАВВ. – Ф. 118. Воп. 1. Спр. 654.
3. ДАВВ. – Ф. 118. Воп. 1. Спр. 742.
4. ДАВВ. – Ф. 118. Воп. 1. Спр. 789.
5. ДАВВ. – Ф. 10051-п. Воп. 1. Спр. 250.
6. ДАВВ. – Ф. 10062-п. Воп. 1. Спр. 127.
7. Інтэрактыўны сэрвіс "Память народа" [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://pamyat-naroda.ru. – Дата доступу: 23.01.2023.
8. Партал "Памяти героев Великой войны 1914–1918 годов" [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://gwar.mil.ru. – Дата доступу: 23.01.2023.
9. Спецыяльны праект "Партизаны Беларуси" [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://partizany.by. – Дата доступу: 23.01.2023.


**Казак О.Г., Середа А.С.**

## ИСТОЧНИКИ ПО ИСТОРИИ ЗАПАДНОПОЛЕССКОГО ЭТНОПОЛИТИЧЕСКОГО ДВИЖЕНИЯ (КОНЕЦ 1980-Х – ПЕРВАЯ ПОЛОВИНА 1990-Х ГГ.)

Деятели западнополесского этнополитического движения, зародившегося в БССР в годы советской перестройки, утверждали, что жители западных районов Брестской области являются отдельным народом – полешуками (ятвягами). Лидером движения стал молодой филолог, поэт и публицист Н.Н. Шелягович. Проблематика западнополесского движения затрагивается в монографии И.А. Пушкина, посвященной общественно-политической и культурной деятельности национальных общностей Беларуси в 1990–2015 г. [1]. В работах К.В. Шевченко [2] и О. Цадко [3] уделяется особое внимание анализу попыток создания западнополесского литературного языка и конструирования лидерами этнополитического движения собственного исторического нарратива. Основными источниками для авторов данных работ стали материалы печатных изданий «Збудінне» («Пробуждение») и «Балесы Полісься» («Голоса Полесья»). Вместе с тем, в фондах белорусских архивов отложился целый массив документов, анализ которых позволяет составить более полную и точную картину западнополесского движения.

Важная информация о генезисе западнополесского движения содержится в документах фондов Центрального научного архива Национальной академии наук Беларуси (ЦНА НАНБ). Особый интерес представляет личное дело лидера движения Н.Н. Шеляговича, являвшегося аспирантом Института языкознания Национальной академии наук БССР в 1984–1986 гг. В частности, в данном фонде отложился реферат дипломной работы Н.Н. Шеляговича за курс филологического факультета Белорусского государственного университета («Краткое фонетико-морфологическое описание одного западнополесского говора»), в которой приводились доказательства того, что говор населения региона может трактоваться как самостоятельный язык. В экспертном заключении на реферат А.А. Кривицкий отметил: «Автор демонстрирует, что он знаком с некоторыми важными работами по говорам Брестского Полесья, но рассуждения автора о статусе этих говоров и их языковых отношений бездоказательные, беспочвенные и удивительные» [4, л. 19–21, 35–35 об.]. Тем не менее, Н.Н. Шелягович был принят в аспирантуру и начал работу над диссертацией. Претензии к работе Н.Н. Шеляговича у сотрудников института возникли в июне 1986 г. (спустя полгода после публикации аспирантом первых стихотворений на западнополесском диалекте в журнале «Беларусь») во время аттестации на ученом совете. Протокол заседания также отложился в фондах ЦНА НАНБ. Участники заседания ученого совета вменяли в вину Н.Н. Шеляговичу отсутствие публикаций и упорядоченной картотеки лексики, «желание создать отдельный литературный полесский язык», «недостаточную политическую образованность» [5, л. 65–68]. Н.Н. Шелягович был отчислен из аспирантуры (формально – по собственному желанию) осенью 1986 г. Данный эпизод, возможно, стали причиной радикализации и политизации западнополесского движения, которое до этого имело исключительно культурно-просветительскую направленность.

В апреле 1988 г. Н.Н. Шелягович и его единомышленники учредили Общественно-культурное объединение (ОКО) «Полісьсе». С октября 1988 г. по декабрь 1991 г. ОКО действовало под эгидой Белорусского фонда культуры (БФК). Богатейший материал по истории западнополесского движения содержится в документах БФК, отложившихся в фонде 1515 Национального архива Республики Беларусь (НАРБ). Среди представленных в фонде документов имеются многочисленные обращения активистов ОКО «Полісьсе» в Президиум правления БФК и иные инстанции, заключения экспертов (в большин-